ДЗ. В. ЖАРЫН

# ГАНЗЕЙСКІЯ ГАНДЛЁВЫЯ СУВЯЗІ СА СТАРАЖЫТНЫМІ БЕЛАРУСКІМІ ГАРАДАМІ Ў XIII-XVстст.

Вядома, што Ганза ў сярэднія вякі мела гандлёвыя стасункі з рознымі краінамі. У сферу яе інтарэсаў патрапілі Англія, Францыя, Нідэрланды. Швецыя, Нарвегія, Данія. Былі нават усталяваны кантакты з Партугаліяй і Венецыяй. Але галоўны напрамак ганзейскага гандлю ішоў на Паўночны Усход Еўропы. Тут яго канчатковым пунктам быў Вялікі Ноўгарад. Сувязі з гэтым горадам мелі для немцаў першаснае значэнне, пра гэта сведчыць наяўнасць тут адной з найбуйнейшых ганзейскіх кантор (двор св. Пятра). Аднак існаваў і іншы, не менш значны напрамак, які па некаторых паказчыках нават пераўзыходзіў Ноўгарад, - праз Былтыйскае мора і Рыжскую затоку ўверх па рацэ Заходняй Дзвіне. Тэты напрамак быў звязаны са старажытнымі беларускімі гарадамі, такімі як Полацк, Віцебск і Смаленск.

Упершыню ў вусці Заходняй Дзвіны немцы з'явіліся ў сярэдзіне XII ст. Урывак з Гановерскага рукапісу хронікі Генрыха Латвійскага дае інфармацыю пра тое, што нямецкія гандляры праніклі ў Падзвінне значна раней за

місіянераў. «У гэтым годзе (1158) нейкія гандляры (брэменскія, як мяркуюць зыходзячы з пабочных звестак), маючы намер паспытаць лёс і пазнаёміцца з рознымі месцамі на сушы і на моры...» з'явіліся ля вусця Дзвіны. У іншым месцы хронікі сцвярджаецца: «Шмат спраў добрых здзейснілася ў Лівоніі ў часы далучэння паганцаў да веры Іісуса Хрыста за 67 год, якія прайшлі з таго часу, як Лівонская гавань упершыню была знойдзена брэменскімі гандлярамі». Такім чынам, відавочна, што першымі, хто знайшоў новыя землі вакол Дзвіны, былі не місіянеры, не рыцары-ваяры, а гандляры. Існуе меркаванне, што ў вусце Дзвіны яны трапілі выпадкова, што іх сюды занесла бура. Але як бы там ні было, пасля гэтага пачаліся іх планамерныя вандроўкі ў вышэйазначаны рэгіён.

Пранікненне немцаў у глыб канты нента праходзіла даволі хутка. Гандаль немцаў з беларускімі гарадамі развіваўся досыць дынамічна. Ужо ў канцы XII - пачатку XШ ст. нямецкія гандляры, таксама як і у Вялікім Ноўгарадзе, мелі свае «двары» ў розных гарадах Полаччыны. Тое, што немцы мелі свае падвор'і ў старажытных беларускіх гарадах, невыпадкова. Амаль усе гэтыя гарады знаходзіліся на водных шляхах і былі вельмі прыдатныя для вядзення гандлю. 3 навакольных зямель сюды прывозіліся прадукты сельскай і лясной гаспадаркі: воск, мёд, драўніна, каноплі, скуры, футра, мяса, сала і інш. Ганзейцы набывалі іх у патрэбнай колькасці, а потым вывозілі з рэгіёна.

Штуршком да больш хуткага развіцця гандлёвых зносін з'явілася заснаванне немцамі ў 1201 г. у вусці Дзвіны горада Рыгі. Землі полацкіх князёў даходзілі амаль да Рыжскай затокі, таму і наспела неабходнасць замацавання гандлёвых зносін, якія ўжо існавалі. Вынікам гэтага стаў шэраг дамоў, заключаных паміж ганзейцамі і старажытнымі беларускімі гзрадамі, галоўнай з якіх з'яўлялася «Смаленская Гандлёвая Праўда» 1229 г. Яна рэгламентавала парадак вядзення гандлю, замацоўвала геаграфічная межы дзеяння абодвух бакоў і давала прававыя падставы для ажыццяўлення гандлёвай палітыкі на месцах.

Пасрэднікамі ў такім гандлі паміж Ганзай і кантынентальнай часткай Усходняй Еўропы з'яўляліся прускія і ліфляндскія гарады. Гарады ўздоўж усходняга берага Балтыйскага мора, а перш за ўсё Рыга, былі апорнымі пунктамі ўсяго ганзейскага гандлю з унутранымі раёнамі старажытнай Русі. Ад Рыгі ўверх па Заходняй Дзвіне накіроўваліся ганзейцы, каб ажыццяўляць гандаль з таямнічымі і поўнымі небяспекі землямі, пра якія ў той час мала што было вядома ў Заходняй Еўропе. Галоўнай мэтай на гэтым шляху быў горад Смаленск. Адзінае тое, што памянёны дагавор спачатку быў заключаны менавіта са Смаленскам, а Віцебск і Полацк да яго далучыліся потым, сведчыць пра тое, што пажаданым для немцаў месцам тут былі Смаленскія землі. Ужо з 1229 г. у Смаленску ўзнікла трывалая арганізацыя нямецкага купецтва са сваімі правамі і абавязкамі. Тут старэйшына нямецкіх гандляроў меў пэўную ўладу.

Напрыклад, ён ажыццяўляў трацейскі суд тіаміж ганзейцамі і жыхарамі горада, а пазней нават быў у складзе мясцовага суда. Пры разглядзе спрэчак ён імкнуўся, безумоўна, адстойваць правы нямецкіх гандляроў. Што датычыцца ганзейскага пасялення ў Смаленску, дык тут, як ужо сцвярджалася, у нямецкіх гандаяроў,былі свае дамы фахверкавай архітэктуры, склады тавараў і царква заходняга звычаю. Пісьмова яна значыцца ў фінансавых запісах Рыгі каля 1289 г., але была пабудавана значна раней.

Росквіт ганзейскага гандаю са Смаленскам прыпадае на канец XII -- сярэдзіну XIV ст. Аднак з цягам часу двор і арганізацыя немцаў у Смаленску страцілі сваё значэнне. Адбылося гэта таму, што на літоўскіх і беларускіх землях утварылася новая дзяржава- Вялікае княства Літоўскае. Вялікія князі імкнуліся перахапіць ініцыятыву ў гандлі са Смаленскам, кантраляваць нямецкіх гандляроў, якія хацелі без пасрэднікаў выходзіць да Смаленскіх земляў. У 1399 г. пасланцы рыжскага гарадскога савета не здолелі пацвердзіць свае правы перад вялікім князем Вітаўтам на валоданне землямі і царквой у Смаленску. Пасля гэтага ганзейскі гандаль са Смаленскам і Віцебскам перапыніўся, а манаполію на гандлёвыя зносіны з Ганзай перахапіў Полацк. Полацк у новых умовах ужо сам зрабіўся тым канчатковым пунктам, куды накіроўваліся нямецкія купцы. Можна сцвярджаць, што ў XIV ст. ён ператварыўся ў моцны цэнтр ганзейскага гандлю ва ўсім Падзвінні. Іншай прычынай узвышэння Полацка было тое, што ён з'яўляўся галоўным горадам Полацкага княства, і ў ім ужо дагэтуль склалася добра арганізаваная карпарацыя мясцовых гандляроў - так званае «вышэйшае купецтва». З гэтым купецтвам немцы ўсталявалі трывалыя сувязі, прынамсі гандлёвыя дамовы з Полацкам існавалі ўжо раней, напрыклад дагавор Полацка з Рыгаю 1210 г. Таксама паміж Рыгаю і Полацкам існавала дамова ад 1300 г. У 1307 г. Полацкая зямля ўвайшлаў склад Вялікага княства Літоўскага, аднак палачане асобна ад вялікакняжацкай улады ў 1330 г. дамаўляліся з Рыгай. Гэта сведчыць пра тое, што яны захавалі адносную самастойнасць у гандлёвай справе з немцамі, а таксама пэўную палітычную аўтаномію ў Вялікім княстве.

Пра нямецкую арганізацыю ў Полацку перш за ўсё можна даведацца з наступных дакументаў, якія былі прызваныя рэгуляваць жыццё і гандаль немцаў у гэтым старажытнабеларускім горадзе: «Усталяванне адзіных мер вагі Рыгі і Ордэна для Полацка» сярэдзіне XIV ст. і «Статут Рыгі для нямецкай канторы ў Полацку» 1393 г.

Памянёныя дакументы былі вельмі падобныя да Ноўгарадскай скры (статута), а ў больш позніх запісах яны так і называліся - schra (скра).

Пра трываласць нямецкай арганізацыі ў Полацку сведчыць пэўная іерархічная сістэма. На чале нямецкага купецтва ў горадзе стаяў старэйшына з паўнамоцтвамі, падобнымі да паўнамоцтваў свайго калегі ў Ноўгарадзе ці

Смаленску. Ён праводзіў агульныя сходы нямецкіх гандляроў, меў пэўную судовую ўладу, мог накладаць арышт на недобрасумленных суайчыннікаў. Цікава і тое, што гэты самы старэйшына збіраў некаторую суму грошаў з кожнай партыі тавараў, якія немцы прывозілі ў Полацк. Для гэтага старэйшына меў памагатых, якія пільна сачылі за прыбыццём у горад таго ці іншага карабля з таварамі. Грошы, назбіраныя ў якасці падаткаў, ішлі ў агульную касу. Потым іх выкарыстоўвалі на розныя справы. Напрыклад, на іх немцы пабудавалі царкву, якая пазней сталася цэнтрам культурнага жыцця ўсіх іншаземцаў у рэгіёне Падзвіння. Царква святой Марыі была пабудавана ў 1406 г. У гэтым годзе вялікі князь Вітаўт даў афіцыйны дазвол на яе будаўніцтва. з той мэтай быў выдзелены кавалак зямлі. Вось што пра гэта сведчыць крыніца: «Се аз великий князь Витовть дали есмо сю нашу грамоту рижаном, што жь дано было имь место оу Полоцоку церковь ставить и отмерено, где имь церков поставить, што ж бы никто не вступался в то место, где имь церков ставить».

Тое, што Вітаўт надаваў вялікую ўвагу зносінам з ганзейцамі. не выклікае ніякага сумнення. Вялікі князь жадаў, каб палачане, безумоўна пад яго патранажам, гандлявалі з немцамі. З іншага боку, ён не хацеў, каб немцы напрамую вялі гандаль са Смаленскам і Віцебскам, абыходзячы Полацк, маючы ад таго вялікія прыбыткі. Гэта сталася галоўнай прычынай, чаму ў канцы XIV - першай палове XV ст. немцы пазбавіліся выхаду да Смаленска. Безумоўна, такое становішча ганзейцам не падабалася, і яны вялі бесперапынную барацьбу вакол дазволу далейшага прасоўвання па Дзвіне да Смаленска. Найбольш востра «смаленскае пытанне» паўстала пасля таго, як у 1340 г. Рыга асобна заключыла са Смаленскам пагадненне. Вырашэнне гэтага пытання было для немцаў вельмі важнай справаю. Але палачане ўпарта адвяргалі ўсе памкненні нямецкіх ганддяроў выходзіць да Смаленска самастойна. Барацьба працягвалася ўсё XV ст. і ў рэшце рэшт скончылася перамогай жыхароў Полацка. У 1498 г. быў выдадзены вялікакняскі прывілей Аляксандра, які канчаткова забараніў рух нямецкіх гандляроў на Смаленск, але разам з тым цалкам гарантаваў свабоду гандлю з Полацкам.

Полацк у сярэднія вякі з'яўляўся цэнтрам ганзейскага гандлю ў Падзвінні. Сюды прыязжалі гандляры з розных нямецкіх гарадоў, напрыклад такіх, як Любек, Брэмен, Расток. Вісмар, Штральзунд. Тут яны праводзілі ў жыццё гандлёвую палітыку Ганзейскага саюза, здзяйснялі таварна-грашовыя аперацыі.

Гандаль Ганзейскага саюза з гарадамі Полаччыны і Смаленшчыны ў XIII—XV ст. быў не адназначны па сваёй сутнасці. З аднаго боку, ганзейцы ў гэтыя рэгіёны неслі еўрапейскую культуру, новыя, дагэтуль невядомыя тавары. З іншага боку, ганзейцы заўсёды імкнуліся перахапіць ініцыятыву ў гандлі з Прыбалтыкай ад полацкіх і смаленскіх князёў. кантраляваць іх дзеянні ў гандлі

з Ноўгарадам, атаксама не дапусціць іх выхаду напрамую праз Балтыйскае мора да Заходняй Еўропы. Гандаль быў падзелены паміж беларускімі і нямецкімі гандлярамі. У сферы ўплыву ганзейцаў заставаліся гарады Лівоніі, Рыга. Вялікае княства трымала ў сваіх руках гандаль са Смаленскам і Масквой. Узаемадзеянне такіх буйных суб'ектаў гандлю, як Ганзейскі саюз і Вялікае княства Літоўскае, прывяло ў сярэднія вякі да стварэння ў Еўропе своеасаблівай эканамічнай прасторы, спрыяла развіццю і росту рамяства, а таксама спецыялізацыі асобных раёнаў.